УДК 947,6 (“1921 – 1939”)

*В.П. ГАРМАТНЫ*

# АГРАРНАЕ ПЫТАННЕ Ў ПРАГРАМЕ БЕЛАРУСКАЙ СЯЛЯНСКА-РАБОТНІЦКАЙ ГРАМАДЫ (1925 – 1927 гг.)

*У артыкуле разглядаецца аграрнае пытанне ў праграме Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ, 1925 – 1927 гг.). У 1920 – 1930-я гг. каля 80% заходнебеларускага насельніцтва складалі сяляне, таму аграрнае пытанне на той час было самым актуальным*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*і злабадзёным. Шматлікія палітычныя партыі прапаноўвалі свае варыянты вырашэння аграрнага пытання, імкнучыся схіліць сімпатыі сялян на свой бок. Дзякуючы прапанаванаму плану вырашэння аграрнага пытання і актыўнай грамадска-палітычнай дзейнасці БСРГ стала найбольш уплывовай і масавай грамадска-палітычнай арганізацыяй Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд.*

## Уводзіны

24 чэрвеня 1925 г. паслы Сейма II Рэчы Паспалітай Браніслаў Тарашкевіч, Сымон Рак-Міхайлоўскі, Павел Валошын і Пётр Мятла выйшлі з Беларускага пасольскага клуба і стварылі пасольскі клуб Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ) [1, с. 32]. Карыстаючыся пасольскай недатыкальнасцю, лідары БСРГ разгарнулі актыўную дзейнасць па стварэнні масавай арганізацыі працоўных Заходняй Беларусі для барацьбы за свае правы, і ў хуткім часе БСРГ з невялікай сеймавай фракцыі перарасла ў шматлікую і аўтарытэтную нацыянальна-дэмакратычную арганізацыю [2, с. 27]. Дзейнасць Грамады ўзначальваў Цэнтральны камітэт (ЦК), на чале якога стаяў Браніслаў Тарашкевіч, членамі ЦК былі С. Рак-Міхайлоўскі, П. Валошын, П. Мятла, М. Бурсевіч, Я. Бабровіч, В. Макоўскі і інш. [3, с. 118].

Што датычыцца крыніц і сэнсу назвы “Грамада”, то наконт гэтага Б. Тарашкевіч даў адказ у апошнім слове на судовым працэсе 1928 г.: «Прыгадаю прысутным тут гімн Янкі Купалы “А хто там ідзе?”. Геній гэты прадчуваў, што народ павінен імкнуцца да сваіх правоў у вялікай грамадзе... Бяда-гора стварылі “Грамаду”» [4, с. 46]. Акрамя таго, БСРГ была ідэйным нашчадкам Беларускай сацыялістычнай грамады (1902 – 1903, 1917 гг.), адным з кіраўнікоў якой у 1917 г. з’яўляўся Б. Тарашкевіч.

## Асноўная частка

Браніслаў Тарашкевіч і яго паплечнікі з сеймавай трыбуны рэзка крытыкавалі прапанаваныя польскімі дзяржаўцамі праекты аграрнай рэформы, а таксама іх аўтараў, падавалі інтэрпеляцыі (скаргі) па фактах парушэння правоў заходнебеларускага сялянства [5]. 26 чэрвеня 1925 г. у Сейм II Рэчы Паспалітай пададзены сумесны законапраект БСРГ, Камуністычнай партыі Польшчы і Незалежнай сялянскай партыі па аграрным пытанні, які прадугледжваў канфіскацыю памешчыцкіх і царкоўных зямель звыш вызначанага максімуму ў 30 га, перадачу зямлі сялянскім камітэтам і падзел яе паміж малазямельнымі і беззямельнымі сялянамі, але сеймавай большасцю праект быў адхілены [6, с. 27; 7, с. 29].

У праграме БСРГ ад 12 мая 1926 г., складзенай Тарашкевічам, па аграрным пытанні галоўнымі мэтамі ставіліся канфіскацыя памешчыцкіх і царкоўных зямель, пераход іх ва ўласнасць дзяржавы і падзел без выкупу паміж заходнебеларускімі малазямельнымі сялянамі і парабкамі, скасаванне інстытуту асадніцтва і г.д., а менавіта:

“IV. Зямля сялянам без выкупу.

8. Усе абшарніцкія і духоўныя землі павінны быць бяз выкупу адабраны ад паноў-абшарнікаў і духавенства і разам з казёнымі праз сялянскія камітэты падзелены паміж мяйсцовымі сялянамі і парабкамі бясплатна.

V. Скасаванне асадніцтва.

9. Б. С.-Р. Грамада дамагаецца скасаваньня як ваеннага, так і цывільнага асадніцтва.

Увесь зямельны запас Заходняе Беларусі павінен быць падзелены паміж мяйсцовымі сялянамі і парабкамі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

VI. Упарадкаваньне зямлі.

10. Б. С.-Р. Грамада падтрымоўвывае перасяленне сялян з вёсак на хутары або на пасёлкі, але толькі пры той умове, што малазямельным зробіцца прырэзка зямлі, каб яны маглі вясьці запраўды самастойную гаспадарку.

11. Побач з гэтым Б. С.-Р. Грамада дамагаецца шырокай мэліорацыі − (а перадусім асушкі балот і лугоў) на скарбовы кошт водле шырокага дзяржаўнага пляну.

12. На заспадараваньне пры пераходзе на хутары і пры парцэляцыі павінна быць дадзена патрэбная помач − грашыма, інвэнтарам, будаўлянымі матэрыялямі.

13. Б. С.-Р. Грамада дамагаецца шырокай аграрнай помачы і таннага крэдыту для сялянства.

14. Усе работы па землеўпарадкаванню павінны быць аднесены на скарбовы кошт.

VII. Лясы і воды.

15. Таксама як землі, усе дворныя і духоўныя лясы і воды павінны перайсьці ва ўласнасць дзяржавы.

16. Грамада дабіваецца, каб сяляне былі забясьпечаны лесам на будоўлю і апал, а таксама пашай для жывёлы.

17. Б. С.-Р. Грамада вядзе барацьбу проціў такога скасаваньня сэрвітутаў, што крыўдзіць сялян на карысць паноў-абшарнікаў".

У праграме БСРГ адзначалася, што толькі цесны саюз сялян і рабочых ("работнікаў") можа ўсталяваць сялянска-рабочы ўрад, які зможа даць сялянам зямлю і "перабудаваць народную гаспадарку і ўвесь дзяржаўны і грамадскі лад на больш разумных і справядлівых падставах ды павясьці народ да лепшае будучыні" [8, с. 4-6]. БСРГ выступала за ўз'яднанне беларускага народа ў межах адной дзяржавы, але пры гэтым не адзначалася неабходнасць уваходжання Заходняй Беларусі ў склад БССР, а выказваліся спадзяванні на стварэнне незалежнай беларускай рэспублікі. Неабходна адзначыць, што Грамада пастанавіла дабівацца вызначаных задач толькі шляхам легальнай і законнай барацьбы на аснове Канстытуцыі II Рэчы Паспалітай і права, што рабіла іх рэалізацыю ў тагачасных умовах фактычна немагчымай. Такім чынам, у праграме БСРГ спалучаліся патрабаванні камуністычнага і нацыянальнага напрамкаў вызваленчага руху Заходняй Беларусі [9, с. 63].

Па аграрным пытанні БСРГ стаяла за развіццё індывідуальных сялянскіх гаспадарак і падтрымку ўрадавай палітыкі камасацыі (хутарызацыі), за што падверглася крытыцы з боку КПЗБ: "Особенно ярко выражено кулацкое влияние на программу Громады в пункте о землеустройстве, где имеется требование комасации... чем фактически смазывается вопрос борьбы за землю без выкупа и противопоставляется коллективизации крестьянства в Сов. Союзе, как единственному пути к выходу крестьянства из нужды, в которой оно прозябает целые века" [10, Арк. 121]. Акрамя таго, варта адзначыць, што Грамада адмаўляла дыктатуру пралетарыяту, абгрунтоўваючы гэта наступным чынам: "Беларусь край аграрны. Сяляне складаюць найвялікшую большасць усяго жыхарства... Работнікі складаюць 0,2 проц. у адношаньні да ўсяго жыхарства. Ясна, што пры гэткай соцыяльнай клясавай структуры Беларусі зусім *ня можа быць ніякай гутаркі аб якойсьці там дыктатуры пралетарыяту*" (курсіў у арыгінале) [11, арк. 3].

Вельмі хутка − на працягу прыкладна аднаго года − БСРГ стала адной з самых масавых і ўплывовых сялянскіх партый Еўропы. Як адзначаў сучаснік,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

«у мала спрактыкаванай палітычна беларускай вёсцы паняцьці "беларус" і "грамадавец" лічыліся роўназначнымі. На пытаньне, ці зьяўляецца даны чалавек членам Грамады, атрымліваўся адказ:

− А як-жа, ён-жа беларус.

...Абшарнік, карэспандэнт (віленскай газеты) "Слова", піша: "Спакойную, ціхую вёску ахапіў нейкі псыхоз, людзі кідаюць працу, выконваючы толькі часткова і нядбайна свае штодзённыя заняткі; усіх апанавала нэрвовая атмасфера чаканьньня нейкіх буйных, дзяржаўных і соцыяльных пераменаў"» [12, с. 43].

БСРГ мела свае друкаваныя органы "Беларуская справа", "Жыццё беларуса", "Народная справа", "Наша воля", "Народны звон", сатырычны часопіс "Маланка". Для зручнасці чытачоў выданні Грамады друкаваліся як кірыліцай, так і лацінкай. Аб папулярнасці друку БСРГ сведчыць той факт, што многія сяляне-беднякі выпісвалі гэтыя газеты ў складчыну, наладжвалі калектыўныя чытанні і абмяркоўвалі газетныя артыкулы [13, с. 27].

Неабходна падкрэсліць, што на I з'ездзе КПЗБ (28 чэрвеня − 25 ліпеня 1928 г.) прагучала крытыка некаторых артыкулаў з друку БСРГ: "У грамадоўскай прэсе... друкуецца рад артыкулаў, якія прадстаўлялі сабой глыбока апартуністычныя, глыбока памылковыя артыкулы, на якія мы павінны былі адрэагаваць самым рашучым чынам... з'яўленне такіх артыкулаў стала магчымым на фоне дыферэнцыяцыі, якая пачалася ў (заходнебеларускай) вёсцы" [14, с. 27].

У выніку актыўнай грамадска-палітычнай дзейнасці БСРГ не толькі асобныя члены, але і цэлыя арганізацыі польскіх палітычных партый пераходзілі ў Грамаду. Напрыклад, восенню 1926 г. у вёсцы Раўкі Скідзельскай гміны Гродзенскага павета Беластоцкага ваяводства мясцовая ячэйка польскай партыі ПНП-"Пяст" у поўным складзе перайшла ў БСРГ і апублікавала зварот у газеце "Народная справа" (№ 22, 07.10.1926 г.): "Мы, ніжэй падпісаныя, быўшыя сябры "Пяста", пераканаўшыся, што гэта − ашуканцкая партыя, што яна бароніць паноў і асаднікаў − нашых ворагаў, а нас, беларусаў, у вастрогі садзіць − выступаем з гэтай кулацкай партыі і запісваемся ў БСРГ, зь якою толькі адною можна перамагчы зло".

Прыведзеная цытата − характэрны прыклад сінтэзу сацыяльна-класавай і нацыянальнай рыторыкі: супрацьпастаўленне беларусаў з панамі і асаднікамі, а таксама ўжыванне яўнага запазычвання з бальшавіцкага лексікону тэрміна "кулацкая партыя" (заможных сялян "кулакамі" ў Заходняй Беларусі ніхто ніколі не называў) [15, с. 155].

У чэрвені 1926 г. у Заходняй Беларусі налічвалася 20 гурткоў Грамады і каля 500 членаў, у жніўні − каля 500 і 12 500, у верасні − каля 1 000 і 40 000, у лістападзе − 1 600 і 65 000 адпаведна [16, Арк. 1]. Гурткі БСРГ існавалі ў кожным заходнебеларускім павеце і нават амаль у кожнай вёсцы [17, с. 122]. Разам з тым такі імклівы рост колькасці членаў БСРГ і пашырэнне яе ўплыву выклікаў насцярожанасць у некаторых выбітных прадстаўнікоў заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Вядомы тагачасны грамадска-палітычны дзеяч Заходняй Беларусі Васіль Рагуля лічыў, што колькасны рост Грамады інспіраваны самімі польскімі ўладамі дзеля наступнага разгрому беларускага руху: "Увесь палітычна сьведомы элемент (Заходняй Беларусі) уліўся ў гурткі і пацягнуў за сабой менш сьведамую большасць. Разам з доказамі нацыянальнага характару кіраўнікі гурткоў гаварылі маласьведамым: "На весну адбудзецца падзел абшарніцкіх маёмасьцяў і ты, каля ня ўвойдзеш у Грамаду, ня будзеш дапушчаны да падзелу...". Лік сяброў гурткоў рос ня днямі, а гадзінамі. Пры слабой нутра-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ной дысцыпліне гурткі самацёкам рэвалюцыянізаваліся ўсё больш і больш. На гэтую дарогу штурхала іх польская дэфензіва” [18, с. 52-53].

У справаздачы за снежань 1926 г. беластоцкі ваявода заўважыў, што “па меры развіцця на вёсцы Грамады замірае культурніцкая праца на карысць хаатычнай палітызацыі той вёскі”. Ваявода назваў БСРГ калосам на гліняных нагах і ў значнай ступені меў рацыю [15, с. 157].

У маі 1926 г. ЦК КПЗБ пастанавіў: выдзеліць для работы ў гуртках БСРГ сваіх членаў, якія хутка ўвайшлі ў склад усіх мясцовых арганізацый Грамады і фактычна кіравалі імі [19, с. 117]. Такім чынам, КПЗБ пачала аказваць вырашальны ўплыў на дзейнасць Грамады і выкарыстоўвала яе як арэну для сваёй легальнай дзейнасці, адначасова накіроўваючы яе ў бок супрацьстаяння польскім уладам, што выклікала рэзкае незадавальненне Юзэфа Пілсудскага і яго паплечнікаў [20, с. 59; 21, с. 310].

13 лістапада 1926 г. паслы Народна-нацыянальнага саюза (ННС) унеслі ў Сейм прапанову аб неадкладным абвяшчэнні БСРГ па-за законам. Ліквідацыю Грамады прадвызначыла пазіцыя буйных памешчыкаў паўночна-ўсходніх ваяводств ІІ Рэчы Паспалітай, асабліва Аляксандра Мяйштовіча, які на той час займаў пасаду міністра юстыцыі [22, с. 183]. У ноч з 14 на 15 студзеня 1927 г. кіраўніцтва і звыш 400 актывістаў Грамады былі польскімі ўладамі арыштаваны [17, с. 125], а ў сакавіку гэтага ж года ўрад аб’явіў БСРГ незаконнай арганізацыяй і распусціў яе, а на месцы ўлады сілай прымушалі здаваць сялян членскія білеты Грамады [23, с. 97]. Такія гвалтоўныя дзеянні былі парушэннем Канстытуцыі, якая гарантавала пасольскую недатыкальнасць, але неўзабаве сеймавая большасць адобрыла арышт кіраўнікоў БСРГ і аб’яўленне яе незаконнаю [22, с. 183].

Дэманстрацыі пратэсту супраць роспуску Грамады адбыліся ў Гродна, Маладзечна, Слоніме, Вілейцы, Ашмянах, Скідзелі і іншых гарадах і мястэчках Заходняй Беларусі [24, с. 43; 25, с. 126-127], а самай вядомай акцыяй стала выступленне ў Косава-Палескім. 3 лютага 1927 г. на рынкавай плошчы павятовага мястэчка Косава Палескага ваяводства па ініцыятыве КПЗБ супраць разгону БСРГ сабралася, па ацэнках розных даследчыкаў, ад 1 500 да 3 000 сялян. Дэманстранты пад чырвонымі сцягамі з рэвалюцыйнымі песнямі прайшлі па цэнтральнай вуліцы мястэчка, пасля чаго адбыліся сутыкненні з паліцыяй, асаднікамі і стральцамі з выкарыстаннем агнястрэльнай зброі. У выніку разгону дэманстрацыі загінула 6 сялян, паранена некалькі дзесяткаў удзельнікаў выступлення [26, с. 80].

У лютым–маі 1928 г. у Вільні праходзіў паказальны судовы працэс над 56 кіраўнікамі і актывістамі Грамады па абвінавачванні ў спробе адарваць Заходнюю Беларусь ад ІІ Рэчы Паспалітай і перадаць яе БССР, а некаторых актывістаў БСРГ польскія ўлады абвінавачвалі ў супрацоўніцтве з савецкай разведкай. Па выніках працэсу Б. Тарашкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, П. Валошын і П. Мятла атрымалі па 12 гадоў, М. Бурсевіч – 8, іншыя ад 3 да 6 гадоў турэмнага зняволення [27, с. 155].

## Заключэнне

Такім чынам, БСРГ дзейнічала на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1925 – 1927 гг. у вельмі неспрыяльных умовах і за гэты кароткі час здолела заваяваць шырокую папулярнасць і падтрымку сярод заходнебеларускага сялянства. Паводле дадзеных даследчыкаў, на студзень 1927 г. у склад БСРГ уваходзіла каля 100 000 членаў і каля 400 000 спачуваючых. Улічваючы тыя абставіны, што Гра-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

мада дзейнічала толькі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, насельніцтва якой складала каля 3 000 000 чалавек, гэта было вельмі шмат.

Па аграрным пытанні БСРГ стаяла на абароне жыццёвых інтарэсаў заходнебеларускага сялянства, за надзяленне яго на льготных умовах зямлёй і стварэнне эканамічна моцных сялянскіх гаспадарак. Грамада не выступала супраць урадавага праекта аграрнай рэформы, а патрабавала правесці яе на ўмовах, якія б задаволілі шырокія масы сялянства тагачаснай Заходняй Беларусі. Для пераважнай большасці заходнебеларускага сялянства БСРГ была адзінай надзеяй на лепшую будучыню, паслядоўным абаронцам іх эканамічных інтарэсаў і грамадзянскіх правоў.

## *СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ*

1. ***Мяшковіч, Н.Я.*** Некаторыя аспекты дзейнасці беларускіх паслоў у польскім сейме 1922 – 1928 гг. / Н.Я. Мяшковіч // Берасцейскі хранограф : зборнік навуковых прац. – Выпуск 2. – Брэст : Выдавецтва С. Лаўрова, 1999. – 400 с. – С. 25–33.
2. Беларуская сялянска-работніцкая грамада. – Менск : Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1928. – 55 с.
3. ***Бергман, А.*** Беларуская сялянска-работніцкая грамада (1925 – 1927 гг.) / А. Бергман // Навуковы зборнік. – Беласток : Галоўнае Праўленне Беларускага Грамадска-культурнага Таварыства ў Польшчы, 1964. – 293 с. – С. 95–130.
4. ***Палуян, У.А.*** Беларуская сялянска-работніцкая грамада / У.А. Палуян. – Мінск : Навука і тэхніка, 1967. – 224 с.
5. Інтэрпеляцыі беларускіх паслоў у польскі Сойм 1922 – 1926 гг. Зборнік дакументаў аб панскіх гвалтах, катаваннях і зьдзеках над сялянамі і рабочымі ў Заходняй Беларусі. – Мінск : Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1927. – 497 с.
6. ***Пашкевіч, А.*** Беларуская сялянска-работніцкая грамада ў першае паўгоддзе існавання (чэрвень–снежань 1925 г.) / А. Пашкевіч // Гістарычны альманах (Гародня-Беласток). – Т. 12 (2006 г.). – С. 23–36.
7. ***Титова, А.А.*** Борьба революционного блока польского Сейма за демократическое решение аграрной проблемы во второй половине 1925 г. / А.А. Титова // Советское славяноведение. – 1988. – № 2. – С. 28–35.
8. Праграма і арганізацыйны статут Беларускае сялянска-работніцкае грамады. – Вільня : Друкарня Н. Левін і Сын, 1926. – 20 с.
9. ***Радзюк, А.Л.*** Нацыянальныя і сацыялістычныя складнікі праграмы і статута беларускай сялянска-работніцкай грамады / А.Л. Радзюк // Труды молодых специалистов Полоцкого государственного университета. Гуманитарные науки. Выпуск 20. – Новополоцк : ПГУ, 2007. – С. 62–64.
10. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 242п. – Воп. 1. – Спр. 101. Материалы об экономическом положении Западной Белоруссии, экономическом, национальном и политическом гнете польского правительства на Западной Белоруссии. Статья Кузнецовой о Громаде и др.
11. НАРБ. – Фонд 242п. – Воп. 1. – Спр. 65. Статьи и вырезки из газет по партийно-марксистскому анализу и характеристике Громады.
12. Заходняя Беларусь на лаве падсудных: працэс Беларускай сялянска-работніцкай грамады 23 лютага–22 мая 1928 г. – Менск : Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1929. – 254 с.
13. ***Сталевіч, А.*** Супроць фашысцкай акупацыі (дзейнасць Беларускай С.-Р. Грамады ў масах) / А. Сталевіч. – Менск : Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1929. – 254 с.
14. ***Говін, С.В.*** Друк Заходняй Беларусі (1921 – 1939 гг.) / С.В. Говін. – Мінск : БДУ імя У.І. Леніна, 1974. – 96 с.
15. ***Токць, С.*** Беларуская вёска ў эпоху зьменаў: другая палова XIX – першая траціна XX ст. / С. Токць. – Мінск : Тэхналогія, 2007. – 308 с.
16. НАРБ. – Ф. 242п. – Воп. 1. – Спр. 104. Материалы о массовой работе “Громады”.
17. ***Сорокин, А.А.*** Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920 – 1939 гг.) / А.А. Сорокин. – Минск : Наука и техника, 1968. – 204 с.
18. ***Рагуля, В.*** Успаміны / В. Рагуля. – Менск : Бацькаўшчына, 1993. – 94 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

19. ***Полуян, В.А.*** Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920 – 1939 гг. / В.А. Полуян, И.В. Полуян. – Минск : Государственное издательство БССР, 1962. – 224 с.
20. ***Бабровіч, Л.*** Аб клясавай барацьбе ў Заходняй Беларусі ў часы БСРГ / Л. Бабровіч, Я. Багданскі. – Мінск : Беларуская Акадэмія Навук, 1932. – 72 с.
21. ***Гарматны, В.П.*** Аграрнае пытанне ў праграмах палітычных партый Другой Рэчы Паспалітай (1921 – 1939 гг.) / В.П. Гарматны // Грамадскія рухі і палітычныя партыі ў Беларусі (апошняя чвэрць XIX – пачатак XXI стст.) : матэрыялы Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі (Гродна, 23-24 кастрычніка 2008 г.). – Гродна : ГрДУ імя Я. Купалы, 2009. – С. 308–312.
22. ***Латышонак, А.*** Гісторыя Беларусі ад сярэдзіны XVII ст. да пачатку XXI ст. / А. Латышонак, Я. Мірановіч. – Беласток : Беларускае гістарычнае таварыства; Вільня : Інстытут беларусістыкі, 2010. – 368 с.
23. ***Бергман, А.*** Слова пра Браніслава Тарашкевіча / А. Бергман. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1996. – 192 с.
24. ***Беразоўскі, А.*** Заходняя Беларусь пад пятой польскіх акупантаў (за што Пілсудзкі разграміў Грамаду) / А. Беразоўскі. – Менск : ЦК МОПР БССР, 1928. – 45 с.
25. ***Ліс, А.С.*** Браніслаў Тарашкевіч / А.С. Ліс. – Мінск : Навука і тэхніка, 1966. – 168 с.
26. Гарады і раёны Берасцейшчыны. Гісторыя і сучаснасць. Івацэвіцкі раён / У.В. Здановіч [і інш.], пад рэд. А.А. Гарбацкага. – Брэст : Брэсцкая друкарня, 2009. – 564 с.
27. ***Кулісевіч, Г.А.*** Браніслаў Тарашкевіч – беларускі грамадска-палітычны дзеяч, мовазнаўца / Г.А. Кулісевіч // Язык. Общество. Медицина : сборник материалов студенческих конференций : материалы семинара преподавателей “Межпредметная координация в процессе преподавания РКИ в негуманитарном вузе” / отв. ред. А.А. Мельникова. – Гродно : ГрГМУ, 2008. – С. 152–155.

Паступіў у рэдакцыю 15.03.2011 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова